УДК 001.32(476)

## РЫЦАР ВЫСОКАГА ДУХУ

*Артыкул прысвечаны памяці беларускага эстэтыка, прафесара М. І. Крукоўскага.*



### *МІКАЛАЙ ІГНАТАВІЧ КРУКОЎСКІ*

(16 лістапада 1923 – 30 верасня 2013), кандыдат філалагічных навук, доктар філасофскіх навук, прафесар.

Аўтар часопіса «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў» з 2003 года.

Мікалай Ігнатавіч Крукоўскі, выдатны беларускі навуковец, філосаф, эстэтык, культуролаг і грамадскі дзеяч, прайшоў плённы і складаны жыццёвы шлях. Ён нарадзіўся ў сялянскай сям'і ў вёсцы Машкова Аршанскага раёна Віцебскай вобласці. У 1938 г. сям'я пераехала ў Оршу, дзе ў 1940 г. Мікалай Ігнатавіч скончыў школу. У гэтым жа годзе паступіў на 1 курс Віцебскага ветэрынарнага інстытута, адкуль у верасні 1941 г. у няпоўныя 18 гадоў добраахвотнікам пайшоў на фронт. У кастрычніку трапіў у акружэнне ў Вяземскі «кацёл» – адну з самых страшэнных катастроф Вялікай Айчыннай вайны. Папаў у палон, адкуль збег і вярнуўся ў Оршу. У 1942 г. ваяваў у партызанскай брыгадзе Канстанціна Заслонава: спачатку быў камандзірам аддзялення, а потым – начальнікам штаба атрада. У 1943 г. быў цяжка паранены ў баі. Пасля шпіталю сядзеў у спецлагеры НКВД для «спецправеркі». Праз некаторы час вярнуўся ў Оршу.

Мікалай Ігнатавіч узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені, медалём «За адвагу», медалём «Партызану Айчыннай вайны» І ступені.

У 1950 г. скончыў філалагічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з чырвоным дыпломам, пасля чаго па ініцыятыве Кандрата Крапівы быў залічаны ў Інстытут мовазнаўства Акадэміі навук БССР малодшым навуковым супрацоўнікам. Абараніў кандыдацкую дысертацыю па лінгвістыцы (1956) і апублікаваў манаграфію «Рускі лексічны ўплыў на сучасную беларускую літаратурную мову».

Навуковыя інтарэсы Мікалая Ігнатавіча мелі шырокі абсяг і ахоплівалі праблематыку філасофіі, лінгвістыкі, эстэтыкі, культуралогіі і іншых галін ведаў.

З 1963 г. выкладаў у БДУ (кафедра гісторыі філасофіі, логікі і эстэтыкі), чытаў курсы па эстэтыцы, сацыялогіі мастацтва і тэорыі мастацкай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

культуры, працаваў у Нацыянальным навукова-асветніцкім цэнтры імя Францыска Скарыны. Абараніў доктарскую дысертацыю на філасофскім факультэце Маскоўскага ўніверсітэта. З 1994 г. і да апошняга часу Мікалай Ігнатавіч з'яўляўся супрацоўнікам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, выкладаў на кафедры філасофіі, працаваў вядучым спецыялістам навукова-даследчага аддзела.

Вучоны прапанаваў арыгінальную эстэтычную канцэпцыю – новую сістэму асноўных эстэтычных катэгорый, распрацоўваў эстэтычны падыход да чалавека як дыялектычнага адзінства духоўнай і фізічнай прыгажосці. Разумеў сутнасць чалавека як дваістай істоты, лічыў, што акрамя патрэб цела і душы існуе патрэба «ў пэўнай раўнавазе паміж целам і душою, паміж розумам і пачуццем, патрэба эстэтычная, для задавальнення якой чалавекам ствараецца і сістэма мастацкіх каштоўнасцей»*.

Мікалай Ігнатавіч Крукоўскі – аўтар шматлікіх артыкулаў, манаграфій, дапаможнікаў па праблемах сучаснай эстэтыкі, культуралогіі, пытанняў станаўлення нацыянальнай самасвядомасці, узаемаадносін культуры і суверэнітэту народа, у тым ліку: «Логіка прыгажосці» (1965), «Асноўныя эстэтычныя катэгорыі: вопыт сістэматызацыі» (1974), «Кібернетыка і законы прыгажосці» (1977), «Homo pulcher. Чалавек прыгожы» (1983), якая была перакладзена на кітайскую мову і выдадзена ў Пекіне, «Філасофія культуры: уводзіны ў тэарэтычную культуралогію» (2000), «Бляск і трагедыя ідэалу» (2004) і інш.

Мікалай Ігнатавіч займаў актыўную жыццёвую пазіцыю, выхаваў не адно пакаленне маладых навукоўцаў. Яго заслугі па праву адзначаны высокімі дзяржаўнымі ўзнагародамі.

Прыгажосць безумоўна выратуе свет, але, па словах Мікалая Ігнатавіча, сёння саму прыгажосць выратоўваць трэба, патрэбна ўсеагульнае адраджэнне, якое прыгажосць ахінае сваім ззяннем, таму дасягненням беларускай філасофскай думкі неабходна даваць жыццё, захоўваць іх і папулярызаваць.

## СПІС АСНОЎНЫХ РАБОТ М. І. КРУКОЎСКАГА І ЛІТАРАТУРЫ ПРА ЯГО

***Працы М. І. Крукоўскага***

1. *Крюковский, Н. И.* Логика красоты / Н. И. Крюковский. – Минск : Наука и техника, 1965. – 461, [2] с.
2. *Крюковский, Н. И.* Кибернетика и законы красоты : филос. очерк / Н. И. Крюковский. – Минск : Изд-во БГУ, 1977. – 256 с.
3. *Крюковский, Н. И.* Homo pulcher. Человек прекрасный : очерки теоретической эстетики человека / Н. И. Крюковский. – Минск : Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1983. – 303 с.

* Крукоўскі М. І. Да праблемы матэматычнага мадэліравання асноўных катэгорый і паняццяў тэарэтычнай культуралогіі // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. 2012. № 1(17). С. 12.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*4. Крукоўскі, М. І.* Філасофія культуры : уводзіны ў тэарэтычную культуралогію : вучэб. дапам. / М. І. Крукоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 2000. – 192 с.

*5. Крукоўскі, М. І.* Бляск і трагедыя ідэалу : (філасофскія эцюды пра ідэалы, дэмакратыю і суверэнітэт) / М. І. Крукоўскі. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2004. – 352 с.

*6. Крукоўскі, М. І.* Патрыятызм / М. І. Крукоўскі // Беларусь : энцыкл. давед. ; рэд. Б. І. Сачанка [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 1995. – С. 567.

*7. Крукоўскі, М. І.* «Верым – значыць існуем!» : [да 400-годдзя Берасцейскай уніі] / М. І. Крукоўскі // Культура. – 1996. – 24–30 верас. (№ 38). – С. 4.

*8. Крукоўскі, М. І.* Спадзяёмся на святое блаславенне : ліст да Сусветнага Архірэя Яна Паўла ІІ Папы Рымскага / М. І. Крукоўскі // Літаратура і мастацтва. – 1996. – 1 лістап. (№ 44). – С. 15.

*9. Крукоўскі, М. І.* Культура як сацыяльная спадчыннасць чалавека / М. І. Крукоўскі // Мастацтва. – 1996. – № 1. – С. 2–4.

*10. Крукоўскі, М. І.* Крэсы гармоніі : дыялектычная будова культуры / М. І. Крукоўскі // Мастацтва. – 1996. – № 2. – С. 2–4.

*11. Крукоўскі, М. І.* Структура культуралагічнай прасторы / М. І. Крукоўскі // Мастацтва. – 1996. – № 3. – С. 2–3.

*12. Крукоўскі, М. І.* Сістэма культуралагічных катэгорый / М. І. Крукоўскі // Мастацтва. – 1996. – № 4. – С. 2–3.

*13. Крукоўскі, М. І.* Такая ж цэласнасць, як чалавек : агульныя рысы структуры асноўных культуралагічных катэгорый / М. І. Крукоўскі // Мастацтва. – 1996. – № 5. – С. 2–4.

*14. Крукоўскі, М. І.* Агляд са шматузроўневай вежы : далейшы аналіз сацыякультурнага поля / М. І. Крукоўскі // Мастацтва. – 1996. – № 6. – С. 2–4.

*15. Крукоўскі, М. І.* «Матэрыяльная культура» – што гэта за матэрыял? / М. І. Крукоўскі // Мастацтва. – 1996. – № 7. – С. 2–4.

*16. Крукоўскі, М. І.* Матэрыяльная каштоўнасць : палітэканамічнае разуменне / М. І. Крукоўскі // Мастацтва. – 1996. – № 8. – С. 2–3.

*17. Крукоўскі, М. І.* Цела культуры духоўнай : будова ўнутранай прасторы матэрыяльнай культуры / М. І. Крукоўскі // Мастацтва. – 1996. – № 9. – С. 2–4.

*18. Крукоўскі, М. І.* Нацыянальная самасвядомасць і мова / М. І. Крукоўскі // Наша слова. – 1996. – 17–23 кастр. (№ 42). – С. 2.

*19. Крукоўскі, М. І.* Праблема беларускага адраджэння і філасофія Гегеля / М. І. Крукоўскі // Беларусіка=Albaruthenica. – Мінск, 1996. – Кн. 7. – С. 155–160.

*20. Крукоўскі, М. І.* «Бацька» ўсяго існага : [духоўная культура беларусаў] / М. І. Крукоўскі // Мастацтва. – 1997. – № 1.– С. 2–4 ; № 2. – С. 2–4 ; № 3. – С. 2–5 ; № 4. – С. 2–4 ; № 5. – С. 2–3.

*21. Крукоўскі, М. І.* Запаліць святло ў душах... : рэальнасць і грамадскі ідэал у сучаснай Беларусі / М. І. Крукоўскі // Літаратура і мастацтва. – 1997. – 7 лістап. (№ 45). – С. 3, 14–15.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*22. Крукоўскі, М. І.* Хто ж сапраўды панясе святло? : [пра ролю беларускай інтэлігенцыі ў адраджэнні нацыянальнай культуры] / М. І. Крукоўскі // Літаратура і мастацтва. – 1998. – 20 сак. – С. 4.

*23. Крукоўскі, М. І.* Беларуская ідэя – наш ратавальны круг / М. І. Крукоўскі // Літаратура і мастацтва. – 1998. – 2 кастр. – С. 2.

*24. Крюковский, Н. И.* Национальная культура и национальное самосознание: традиции и перспективы / Н. И. Крюковский ; пер. с белорус. В. Коваленко // Всемирная литература. – 1998. – № 5. – С. 145–159.

*25. Крукоўскі, М. І.* Чалавек не можа не тварыць : [тэорыя мастацкай культуры] / М. І. Крукоўскі // Мастацтва. – 1998. – № 2. – С. 2–4 ; № 3. – С. 2–5 ; № 4. – С. 2–4.

*26. Крукоўскі, М. І.* Беларуская ідэя – і сумленне, і душа, і сцяг... / М. І. Крукоўскі // Беларусь. – 1999. – № 2. – С. 13–14.

*27. Крюковский, Н. И.* Отчего мир во зле лежит? : К онтологическому аспекту проблемы зла / Н. И. Крюковский // Всемирная литература. – 1999. – № 2. – С. 183–189.

*28. Крукоўскі, М. І.* З гарчычнага зярнятка... : як была зніштожана нацыянальная эстэтычная школа / М. І. Крукоўскі // Мастацтва. – 2000. – № 2. – С. 12–15.

*29. Крукоўскі, М. І.* Патрыятызм / М. І. Крукоўскі // Беларус. энцыкл. : у 18 т. – Мінск : БелЭн, 2001. – Т. 12. – С. 183.

*30. Крукоўскі, М. І.* Структура культуралагічнай адукацыі / М. І. Крукоўскі // Культура Беларусі : стан і перспектывы развіцця : зб. арт. / Беларус. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2001. – С. 23–34.

*31. Крукоўскі, М. І.* Глабалізацыя і постмадэрнізм. Куды яны вядуць? / М. І. Крукоўскі // Мастацтва. – 2002. – № 9. – С. 4–8.

*32. Крукоўскі, М. І.* Залаты век Беларусі і сучаснасць / М. І. Крукоўскі // Рэфармацыя і залаты век Беларусі : матэрыялы навук.-практ. канф., Мінск, 1 чэрв. 2002 г. / МГА «Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына"». – Мінск, 2002. – С. 35–39.

*33 Крукоўскі, М. І.* Нацыянальная культура і суверэнітэт : кароткія тэзісы / М. І. Крукоўскі // Прырода, чалавек, культура : праблемы гармоніі : матэрыялы навук. канф., Мінск, 25–26 сак. 2003 г. : у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2003. – Ч. 1. – С. 157–162.

*34. Крукоўскі, М. І.* Якая ж эстэтыка нам патрэбна? / М. І. Крукоўскі // Мастацтва. – 2003. – № 10/11. – С. 4–5.

*35. Крукоўскі, М. І.* Праз трагічнае да прыгажосці! : успамін-роздум пра беларускую партызанскую мінуласць / М. І. Крукоўскі // Мастацтва. – 2004. – № 7/8. – С. 4–5.

*36. Крукоўскі, М. І.* Кніга і яе месца ў сістэме культуры / М. І. Крукоўскі // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. : у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2006. – Ч. 2. – С. 52–55.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Артыкулы ў часопісе «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў»***

1. *Крукоўскі, М. І.* Структура канкрэтнага сацыякультурнага феномена і праблема агульнага вызначэння яго каштоўнасці : матэрыялы інструкцыйных рэкамендацый для экспертаў / М. І. Крукоўскі // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2003. – № 2. – С. 77–84 ; 2004. – № 3. – С. 10–17.

2. *Крукоўскі, М. І.* Тэарэтычная культуралогія, яе сутнасць і перспектывы / М. І. Крукоўскі // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2006. – № 6. – С. 10–18.

3. *Крукоўскі, М. І.* Тэарэтычная культуралогія : наколькі яна можа быць дакладнай навукай / М. І. Крукоўскі // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2008. – № 9. – С. 5–11.

4. *Крукоўскі, М. І.* Катэгорыі цыкла і суперцыкла ў тэарэтычнай культуралогіі / М. І. Крукоўскі // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2010. – № 2 (14). – С. 5–12.

5. *Крукоўскі, М. І.* Да праблемы матэматычнага мадэліравання асноўных катэгорый і паняццяў тэарэтычнай культуралогіі / М. І. Крукоўскі // Весн. Беларус. дзярж. ун-та культуры і мастацтваў. – 2012. – № 1(17). – С. 5–16.

***Навуковы кіраўнік дысертацый, якія падрыхтаваны супрацоўнікамі БДУКМ***

1. *Коган, И. Л.* Моральные категории добра и зла в религиозном мироощущении (культурологический аспект) : дис. ... канд. культурологии : 24.00.01 / И. Л. Коган ; [науч. рук. Н. И. Крюковский]. – Минск, 1999. – 111 л.

2. *Шумская, И. М.* Музыкальное творчество как социокультурное явление : дис. ... канд. культурологии : 24.00.01 / И. М. Шумская ; [науч. рук. Н. И. Крюковский]. – Минск, 2002. – 110 л.

3. *Яконюк, Н. П.* Народно-инструментальная музыкальная культура письменной традиции в Беларуси : дис. ... д-ра искусствоведения : 17.00.09 / Н. П. Яконюк; [науч. рук. Н. И. Крюковский]. – Минск, 2003. – 253, [3] л.

***Артыкулы аб М. І. Крукоўскім і інтэрв'ю з ім***

1. *Бараноўскі, П. М.* Крукоўскі Мікалай Ігнатавіч / П. М. Бараноўскі // Беларус. энцыкл. : у 18 т. – Мінск: БелЭн, 1999. – Т. 8. – С. 485.

2. *Дубянецкі, Э. С.* Крукоўскі Мікалай Ігнатавіч / Э. С. Дубянецкі // Культуралогія : энцыкл. давед. / Э. С. Дубянецкі. – Мінск : БелЭн, 2003. – С. 177.

3. *Крюковский* Николай Игнатьевич // Республика Беларусь : энцикл. : в 8 т. – Минск : БелЭн, 2007. – Т. 4. – С. 327.

4. Мікалай Ігнатавіч Крукоўскі // Вікіпедыя : свабодная энцыкл. [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://be.wikipedia.org/wiki/. – Дата доступу: 23.10.2013.

5. *Крукоўскі, М. І.* «Бездухоўнасць кідае выклік рыцарам высокага духу» : маналог чалавека, абцяжаранага паўвекавым вопытам служэння філасофіі : [гутарка з прафесарам БУК М. Крукоўскім] / М. І. Крукоўскі ; запісаў У. Траццякоў // Літаратура і мастацтва. – 1997. – 25 крас. (№ 17). – С. 5.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. *Крукоўскі, М. І.* Надзея надзей : Рэлігія і праблема адраджэння беларускай нацыянальнай культуры / М. І. Крукоўскі ; запісаў У. Траццякоў // Мастацтва. – 2001. – № 1. – С. 2–5.

7. *Крукоўскі, М. І.* Чалавек выключнага таленту : інтэрв'ю з прафесарам, доктарам філасофскіх навук М. І. Крукоўскім пра яго жыццёвы шлях / М. І. Крукоўскі ; запісала Т. М. Бабіч // Музычнае і тэатральнае мастацтва : праблемы выкладання. – 2005. – № 3. – С. 58–60.

*Складальнікі*
***І. І. Паус, В. М. Сакалова***

УДК 784.96(092)(476)

## ЧАЛАВЕК У МАСТАЦТВЕ

*Артыкул прысвечаны памяці заслужанага работніка культуры БССР С. І. Дробыша.*



### *СТАНІСЛАЎ ІОСІФАВІЧ ДРОБЫШ*

(17 сакавіка 1939 – 31 кастрычніка 2013), вядомы ў рэспубліцы і за мяжой хормайстар, педагог і прапагандыст народнахаравога мастацтва, заслужаны работнік культуры БССР, прафесар, загадчык кафедры беларускай народна-песеннай творчасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Station

Станіслаў Іосіфавіч нарадзіўся ў в. Заграддзе Слуцкага раёна Мінскай вобласці. Маленькая вёска ў некалькі двароў сваёй школы не мела, таму, каб спазнаць плён навукі, прыходзілася хадзіць за дзесяць кіламетраў пехатой. Сям'я зведала і галоту, і нястачу: бацька загінуў у Вялікую Айчынную вайну, але маці выхавала годных і адукаваных людзей. Сястра Станіслава Іосіфавіча была першая з вёскі, хто атрымаў вышэйшую адукацыю, і менавіта яна прывозіла з горада новыя песні, якія з вялікай асалодай завучваліся і спяваліся перад мясцовымі слухачамі.

Станіслаў Іосіфавіч марыў звязаць жыццё са спевамі і паступіць у музычнае вучылішча, але трэба было здаваць сальфеджыа, што без спецыяльнай адукацыі было немагчыма. Станіслаў Іосіфавіч скончыў Беларускі дзяржаўны інстытут народнай гаспадаркі і атрымаў спецыяльнасць бухгалтар-эканаміст. Падчас вучобы спяваў у народным хоры Палаца культуры прафсаю-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ